# § 2. Спробы дзяржаўнага самавызначэння Беларусі

***Успомніце.*** **1.** Што такое аўтаномія?

**2.** Як прапаноўвалася вырашыць нацыянальнае пытанне згодна з Дэкларацыяй правоў народаў Расіі?

**3.** У чым заключалася пазіцыя Аблвыкамзаха па беларускім нацыянальным пытанні?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць, у чым заключалася ідэя ўтварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці і ці была яна рэалізавана.

**Скліканне I Усебеларускага з'езда і яго рашэнні.** Пазіцыя Аблвыкамзаха па вырашэнні нацыянальнага пытання ў Беларусі не задавальняла дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Ён быў прадстаўлены Вялікай беларускай радай (ВБР) і Беларускім абласным камітэтам (БАК), утвораным у Петраградзе пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў. Дзеячы ВБР прызналі Савет Народных Камісараў на чале з У. І. Леніным у Петраградзе, але адмовіліся прызнаць уладу Аблвыкамзаха ў Беларусі. Яны лічылі, што ён выказвае інтарэсы не ўсяго беларускага народа, а толькі салдат Заходняга фронту. Прадстаўнікі БАК разглядалі Аблвыкамзах як часовую грамадзянскую і ваенную ўладу ў Беларусі, чые паўнамоцтвы спыняюцца з моманту ўтварэння новай улады, выбранай на Усебеларускім з'ездзе.

ВБР і БАК выступілі з ініцыятывай склікання ў Мінску Усебеларускага з'езда, які павінен быў вырашыць пытанне аб беларускай дзяржаўнасці. Савецкі ўрад у Петраградзе прыняў рашэнне аб аказанні фінансавай дапамогі БАК для правядзення з'езда. Тагачасны народны камісар па справах нацыянальнасцяў І. В. Сталін падтрымаў ідэю правядзення з'езда на аснове кампрамісу (пагаднення) паміж Аблвыкамзахам і БАК.

І. В. Сталін заявіў: «Калі беларусы пажадаюць не рэспубліку, а толькі аўтаномію, мы пойдзем на гэта. Важна, каб на чале аўтаноміі былі камуністы і нашы людзі. Усё адно бальшавікі арганізуюць Савет рэспублік, і ў ім Беларусь зойме месца самастойнай савецкай дзяржавы».

Усебеларускі з'езд адбыўся **5—18 снежня 1917 г.** у Мінску. Усяго было зарэгістравана 1872 дэлегаты. На з'езд прыехалі прадстаўнікі ад Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў, а таксама ад усіх франтоў і тылу. Большасць удзельнікаў складалі сяляне, бежанцы, вайскоўцы, рабочыя. Дэлегаты з'езда прадстаўлялі як усе пласты беларускага насельніцтва, так і розныя

Правообладатель Издательский центр БГУ

палітычныя арганізацыі, якія дзейнічалі ў Беларусі. Пры абмеркаванні шматлікіх пытанняў дэлегаты ўпэўніліся, што вырашэнне надзённых праблем у інтарэсах большасці беларускага насельніцтва немагчыма без арганізацыі ўласнай дзяржавы і стварэння краёвай улады. З’езд абвясціў рэспубліканскі лад на беларускіх землях. Удзельнікі з’езда прызналі ўсерасійскую савецкую ўладу, аднак не прызналі ўлады Аблвыкамзаха.

На з’ездзе разгарнулася вострая дыскусія наконт вызначэння формы беларускай дзяржаўнасці. Так, прыхільнікі ВБР дабіваліся абвяшчэння Беларусі як раўнапраўнай рэспублікі ў складзе агульнарасійскай федэрацыі народаў і краёў. Дэлегаты ад БАК прапаноўвалі абласную аўтаномію Беларусі ў складзе Савецкай Расіі. Было вырашана з ліку дэлегатаў стварыць часовы орган краёвай улады — Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Яму даручалася ў найбліжэйшы час склікаць Усебеларускі Устаноўчы сход і на ім вырашыць пытанне аб афармленні беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

№ 1

Дэлегаты з’езда паспелі аднагалосна прыняць толькі першы пункт рэзалюцыі з’езда аб стварэнні Усебеларускага Савета як часовага органа краёвай улады. Кіраўніцтва Аблвыкамзаха, разумеючы пагрозу сваёй уладзе, з дапамогай вайсковай сілы разагнала з’езд. Аднак ніякіх законных падстаў для гэтага не існавала.

**Наступленне войскаў кайзераўскай Германіі. Брэсцкі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі.** Працягвалася Першая сусветная вайна, і ў гэтых умовах савецкі ўрад у адпаведнасці з прынятым ім Дэкрэтам аб міры прапанаваў бакам, якія ваявалі, неадкладна прыступіць да перагавораў аб заключэнні міру. Але, не атрымаўшы адказу, вымушаны быў пачаць непасрэдныя перамовы з Германіяй, манархам якой у той час быў кайзер (імператар) Вільгельм II. Аднак германскі бок выставіў патрабаванні перадачы яму значнай тэрыторыі Савецкай Расіі, у тым ліку большай часткі Беларусі. Савецкі бок адмовіўся ад падпісання міру на такіх умовах. Выкарыстаўшы сітуацыю, якая склалася, германскае камандаванне аднавіла баявыя дзеянні і ў пачатку 1918 г. распачало наступленне. Рэшткі былой царскай арміі былі не ў стане аказаць супраціўленне і адыходзілі. Наступленне войскаў кайзераўскай Германіі спынілі падраздзяленні Чырвонай Арміі, якая пачала фарміравацца са студзеня 1918 г. (**)

Небяспека для існавання савецкай улады, што ўзнікла ў выніку наступлення германскіх войскаў, прымусіла ўрад на чале з У. І. Леніным падпісаць мір на прадыктаваных германскім бокам умовах. Мірны дагавор быў заключаны **3 сакавіка 1918 г.** пасля перамоў у Брэст-Літоўску (цяперашні Брэст) паміж Савецкай Расіяй, з аднаго боку, і Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй, Турцыяй — з другога. Ад Савецкай Расіі адчужалася тэрыторыя памерам каля 1 млн км$^2$ з насельніцтвам больш за 50 млн чалавек. Акрамя таго, прадугледжваліся выплаты ў памеры 6 млрд нямецкіх марак.


Правообладатель Издательский центр БГУ




Беларусь ва ўмовах германскай акупацыі і Брэсцкага міру

*Вызначце, карыстаючыся картасхемай, наступствы мірнага дагавору з Германіяй для насельніцтва беларускіх земель.*

Інтарэсы беларусаў падчас мірных перамоў не ўлічваліся ніводным з бакоў. **Брэсцкі мір**, які фармальна завяршыў удзел Расіі ў Першай сусветнай вайне, цалкам ігнараваў існаванне Беларусі. Пад германскай акупацыяй

Правообладатель Издательский центр БГУ

апынуліся 4/5 тэрыторыі Беларусі, якія разглядаліся прадстаўнікамі германскай адміністрацыі толькі як зона баявых дзеянняў, прыфрантавая паласа або тылавы раён. У лістападзе 1918 г., пасля паражэння аўстра-германскага блока ў Першай сусветнай вайне, перамогі Лістападаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і звяржэння манархіі ў Германіі, савецкі ўрад скасаваў Брэсцкі мір.

**Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).** Пасля разгону Усебеларускага з'езда частка яго дэпутатаў правяла падпольнае пасяджэнне. На ім быў створаны Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда. 21 лютага 1918 г. ён звярнуўся да народа Беларусі з Першай Устаўной граматай, у якой абвясціў сябе часовай уладай на тэрыторыі Беларусі. Гэтая падзея адбылася ва ўмовах наступлення германскіх войскаў, калі кіраўнікі Аблвыкамзаха пакінулі Мінск. У грамаце абвяшчалася права беларускага народа, як і іншых народаў, на самавызначэнне. Быў створаны ўрад — Народны сакратарыят Беларусі.

Ва ўмовах германскай акупацыі 9 сакавіка 1918 г. Выканкам Рады Усебеларускага з'езда прыняў Другую Устаўную грамату. У ёй абвяшчалася стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) на тэрыторыі рассялення і колькаснай перавагі беларускага народа. У грамаце таксама аб'яўляліся дэмакратычныя свабоды, роўнасць моў народаў Беларусі, скасаванне прыватнай уласнасці на зямлю і перадача яе без выкупу сялянам, 8-гадзінны рабочы дзень.

№ 2

Рада Усебеларускага з'езда, пераўтвораная ў Раду БНР, у Трэцяй Устаўной грамаце **25 сакавіка 1918 г.** абвясціла незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. Была прынята пастанова аб наданні беларускай мове статусу дзяржаўнай. Атрыбутамі дзяржаўнасці сталі герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг.

Сярод ініцыятараў абвяшчэння БНР былі А. А. Смоліч і А. І. Луцкевіч.

**Аркадзь Антонавіч Смоліч** (1891—1938). Ураджэнец Мінскай губерні Расійскай імперыі (цяпер Клічаўскі раён Магілёўскай вобласці). Удзельнік Усебеларускага з'езда. Паводле яго даклада была прынята Трэцяя Устаўная грамата. Аўтар выдадзенага ў 1919 г. першага падручніка па геаграфіі Беларусі, які пачынаўся словамі: «Каб Беларусь перастала быць краем, невядомым для саміх беларусаў». У 1920—1922 гг. працаваў настаўнікам у Віленскай беларускай гімназіі, стаў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы. Першы беларускі прафесар геаграфіі.



А. А. Смоліч



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Антон Іванавіч Луцкевіч** (1884—1942). Ураджэнец Ковенскай губерні Расійскай імперыі (цяпер Літва). Палітычны і грамадскі дзеяч, гісторык, педагог, літаратурны крытык. Разам з братам Іванам стаў заснавальнікам Беларускай сацыялістычнай грамады. А. І. Луцкевіч з'яўляўся ініцыятарам стварэння газеты «Наша Ніва» і першага нацыянальнага музея ў Вільні. Па яго прапанове 25 сакавіка 1918 г. была абвешчана незалежнасць БНР.



А. І. Луцкевіч

*1. Вызначце ролю згаданых гістарычных асоб як прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай эліты ў афармленні беларускай дзяржаўнасці.*
*2. Правядзіце ўяўнае інтэрв'ю з адным са згаданых гістарычных дзеячаў. Выкарыстайце адпаведную метадычную параду на с. 179.*

**Дзейнасць Рады БНР.** Абвяшчэнне БНР адбылося ва ўмовах германскай акупацыі. Германская ваенная адміністрацыя не перашкаджала Радзе БНР займацца культурна-асветніцкай і эканамічнай дзейнасцю. Выдаваліся падручнікі, адкрываліся беларускія школы, была арганізавана Беларуская гандлёвая палата.

Шэраг дзеячаў Рады БНР спадзяваліся на афіцыйнае прызнанне Германіяй незалежнасці рэспублікі. Яны накіравалі на імя германскага кайзера Вільгельма II тэлеграму, спадзеючыся на яго падтрымку, аднак гэтага не адбылося. Такі крок не мог знайсці адабрэння ў беларускага народа, які лічыў германскі акупацыйны рэжым варожым.

№ 3

Адзін з тых, хто падпісаўся пад тэлеграмай, Язэп Лёсік, ужо ў 1930 г. згадваў: «Мы разумелі, што нямецкая акупацыя не трывалая, часовая і што тэлеграма Вільгельму... нам патрэбна была для беларускай нацыянальнай справы; нам неабходна было крычаць на ўсю Еўропу, што Беларусь жыве і патрабуе свайго месца сярод народаў».

Не падтрымалі тэлеграму і некаторыя дзеячы ўрада БНР. Адзін з яго прадстаўнікоў Тамаш Грыб, пакідаючы ўрад БНР, заявіў: «...Я, народны сакратар земляробства, пратэстую супраць такой тэлеграмы германскаму манарху ад імя ўсяго беларускага народа і лічу здрадай рэвалюцыйнаму сацыялізму ўваходзіць у саюз з манархам і аддаваць у апеку імперыялістычнай буржуазнай Германіі наш шматмільённы працоўны сялянскі народ...»

*Чаму тэлеграма на імя германскага кайзера Вільгельма II была так неадназначна ўспрынята часткай дзеячаў БНР?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

У савецкай навуковай і вучэбнай літаратуры абвяшчэнне БНР і яе незалежнасці або замоўчвалася, або падавалася як нацыяналістычная спроба супрацьстаяння савецкай уладзе. Абвяшчэнне БНР і яе незалежнасці лічылася прыкладам афармлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці на буржуазнай аснове.

Сучасныя беларускія гісторыкі лічаць, што БНР з'явілася толькі зародкам дзяржаўнага ўтварэння і ва ўмовах германскай акупацыі не зрабілася рэальнай дзяржавай. Разам з тым былі здзейснены практычныя захады па рэалізацыі ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці.

Утварэнне самастойнай дзяржавы прадугледжвае не толькі яе абвяшчэнне, але і функцыянаванне рэальнай сістэмы органаў улады на пэўнай тэрыторыі, прынясце законаў, ажыццяўленне канкрэтных знешніх і ўнутрыпалітычных функцый.

Такім чынам, скліканне Усебеларускага з'езда, абвяшчэнне БНР і яе незалежнасці сталі спробай рэалізацыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Яна разглядаецца як асобая прымета ў развіцці беларускай нацыі, звязаная з утварэннем уласнай дзяржавы.

***Новыя паняцці і тэрміны***: *Брэсцкі мір.*

** У пачатку 1918 г. Савет Народных Камісараў Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі прыняў дэкрэты «Аб Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі» і «Сацыялістычная Айчына ў небяспецы!». Пачалося стварэнне новай арміі. Яе падраздзяленні прынялі сваё баявое хрышчэнне ў бітвах з германскімі войскамі. Дзень 23 лютага 1918 г. стаў святкавацца ў савецкім грамадстве як Дзень Чырвонай Арміі. У гонар тагачасных падзей і ў знак гістарычнай пераемнасці 23 лютага адзначаецца ў нашай краіне як агульнарэспубліканскае свята — Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

1. Дакажыце, што ў сакавіку 1918 г. Беларусь стала аб'ектам знешняй палітыкі іншых дзяржаў.
2. Якімі былі прапановы дэлегатаў Усебеларускага з'езда па вызначэнні формы беларускай дзяржаўнасці?
3. Выкажыце меркаванне, чаму абвешчаная Беларуская Народная Рэспубліка атрымала такую назву.
4. Пачніце запаўненне ў сшытку табліцы «Афармленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці» (гл. с. 19).



Правообладатель Издательский центр БГУ

| Афармленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Час (дата) | Гістарычная падзея | Ініцыятары (удзельнікі) | Прычыны падзеі (матывы дзеянняў) | Вынікі |
| | | | | |

# § 3. Стварэнне беларускай савецкай дзяржавы

***Успомніце.*** Назавіце гістарычныя факты, якія сведчылі аб афармленні беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

***Вучэбная задача.*** Вызначыць супярэчнасці ў працэсе афармлення беларускай савецкай дзяржавы і яго вынікі.

**Стварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ).** Скліканне ў снежні 1917 г. Усебеларускага з’езда, а затым абвяшчэнне БНР і яе незалежнасці сталі адными з тых фактараў, якія абумовілі прыняцце бальшавіцкім кіраўніцтвам рашэння аб стварэнні беларускай дзяржавы на савецкай аснове. **Дзяржава** — гэта палітычная форма арганізацыі грамадства, з дапамогай якой рэгулююцца сумесная дзейнасць і ўзаемаадносіны людзей; тэрытарыяльны саюз (аб’яднанне, супольнасць) грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх правоў на жыццё, свабоду, маёмасць. У працэсе стварэння беларускай савецкай дзяржавы важную ролю адыграла пазіцыя па нацыянальным пытанні У. І. Леніна. Ён як кіраўнік савецкага ўрада лічыў, што любая нацыя мае права на тую форму дзяржаўнасці, якую лічыць для сябе прымальнай. Такім чынам, за беларускім народам прызнавалася права на нацыянальнае самавызначэнне і самастойнае дзяржаўнае існаванне.

24 снежня 1918 г. Цэнтральны камітэт Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) — ЦК РКП(б) пад уплывам У. І. Леніна прыняў рашэнне аб неабходнасці стварэння беларускай савецкай дзяржавы. На наступны дзень у мэтах правядзення ў жыццё дадзенай пастановы адбылася нарада ў народнага камісара па справах нацыянальнасцяў І. В. Сталіна.

У пратаколе нарады адзначалася, што па прычыне «цяперашніх міжнародных адносін і з мэтай умацавання і пашырэння заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі ў сусветным маштабе ў сучасны момант цалкам наспела неабходнасць абвяшчэння Беларусі як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыі, незалежнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі».

Кіраўніцтва РКП(б) было ўпэўнена, што чалавецтва знаходзіцца напярэдадні сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Таму рашэнне аб стварэнні беларускай савецкай дзяржавы прымалася цэнтральным партыйным кіраўніцтвам зыходзячы перш за ўсё з палітычных меркаванняў.

*Вызначце, у чым заключалася супярэчлівасць прынятага на нарадзе пратакола.*

Правообладатель Издательский центр БГУ